Сузор'ямі дабрыні і цяпла бачацца мацярынскія вочы ў паэтычных радках Р.Барадуліна.

Вобраз маці праходзіць праз усю творчасць паэта, канкрэтызуецца і набывае новыя рысы. Маці паўстае Мадоннай, Святой Заступніцай, паэт шукае яе падтрымкі ў спасціжэнні Айчыны і вяртанні да родных вытокаў, чакае матчынай малітвы "супраць злосці, хваробы і войнаў і бітваў, неўраджаяў…" [4, 69], просіць абароны ад чорнай зграі бяспамяцтва.

Гімн жанчыне і яе долі гучыць у вершах "Ліст да маткі", "Матчын хлеб", "Як лета пакліча…", "Бі мяне біткай". Увасабленнем ахвярнай і святой любові з'яўляецца постаць Маці, не выпадкова вылучаная творцам у архетыповыя сімвалы сваёй паэзіі.

У зборніку "Жнівень слоў" вобраз маці зліваецца з вобразам малой радзімы – Беласточчыны і набывае ўзвышанае, маштабнае значэнне. Да архетыпу маці далучаецца архетып Маці-Зямлі – прарадзіцелькі ўсяго жывога.

Уменне напоўніць змест твора універсальным сэнсам, праз уласнае, асабістае закрануць і ўсхваляваць чытача адчуваецца ў драматычных радках памяці роднага чалавека.

Паэт успамінае матчыны слёзы і надзеі, з пакораю гаворыць пра свае нягодныя ўчынкі і памылкі, просіць за іх прабачэнне:

…прабач усё тое, матуля,
што сам я сабе не прабачу [4, 52]

Матыў прабачэння, раскаяння гучыць і ў паэзіі Р.Барадуліна:

Даруй, што спазніўся
Пачуць тваё апошняе слова…
Даруй, што шчырасць тваю
Выстуджваў, як сівер, сурова [2, 61]

Заключэнне. Такім чынам, паэтычны вобраз у паэзіі А.Барскага выступае як адзіная форма існавання думкі і перажывання. Адным з асноўных архетыпаў у лірыцы паэта з'яўляецца вобраз маці: яго разнастайныя архетыпічныя ўяўленні. Па-першае, маці-ахоўніца сямейнага дабрабыту, па-другое, захавальніца роднага слова, аберагальніца традыцый, па-трэцяе, маці атаясамліваецца з вобразам малой радзімы –Беласточчыны. Усе гэтыя архетыпічныя ўвасабленні характарызуюцца адзінасцю і з'яўляюцца важнымі.

Спіс літаратуры.

1. Барадулін Р. Збор твораў у 5-ці т. Т. 1. Вершы / Прадм. В. Сёмухі. – Мн.: Маст. літ., 1996.
2. Барадулін Р. Маўчанне перуна: Новая кніга. – Мн.: Маст. літ., 1986.
3. Барскі А. З пабачанага і перажытага. – Мн.: Маст. літ., 1992.
4. Барскі А. Лірычны пульс: Вершы. – Мн.: Маст. літ., 1987.

АСАБЛІВАСЦІ ЎЛАСНЫХ АСАБОВЫХ ІМЁН ЖЫХАРОЎ МЁРСКАГА РАЁНА ВІЦЕБСКАЙ ВОБЛАСЦІ

Г.К. Семянькова
Віцебск, ВДУ імя П.М. Машэрава

Рэгіянальная антрапанімія з'яўляецца нацыянальным здабыткам беларусаў і неад'емнай часткай лексічнай сістэмы беларускай мовы ў цэлым. Антрапонімы нярэдка ўтрымліваюць "зашыфраваную" інфармацыю пра шляхі гістарычнага

Репозиторий ВГУ

развіцця, асаблівасці рассялення народа, яго сувязі з іншымі этнасамі, адметнасцямі яго традыцый, звычаяў. Таму аналіз такіх адзінак з'яўляецца важнай задачай для беларускай філалогіі.

Матэрыял і метады. Матэрыялам паслужылі найменні жыхароў наступных населеных пунктаў Мёрскага раёна: Захарні, Дворнае Сяло, Пацеенкі, Свярдлы, Станулева, Сушкі, Чэрасы, Якубаўшчына. Антрапанімныя адзінкі былі сабраны з пагаспадарчых кніг Мёрскага сельсавета. Агульная колькасць ўласных асабовых імён – 169. Выкарыстаны наступныя метады даследавання: апісальны, параўнальна-гістарычны метады, элементы статыстычнага аналізу, інвентарызацыя антрапанімнага матэрыялу.

Вынікі і абмеркаванне. Каб уявіць асаблівасці наймення жыхароў Мёрскага раёна ў розныя гістарычныя перыяды, былі праведены тры сінхронныя зрэзы ў перыяды 1920-1949 гг., 1950-1979 гг., 1980-2009 гг. Частотнасць імён вызначалася праз сярэдні каэфіцыент аднайменнасці, які атрымліваецца дзяленнем колькасці нованароджаных на колькасць імён [1, 37].

У перыяд 1920-1949 гг. сярэдні каэфіцыент аднайменнасці жаночых імён роўны 3: колькасць нованароджаных дзяўчынак (198) дзеліцца на колькасць імён (68). Частымі з колькасцю носьбітаў 3 і болей аказаліся імёны (іх 25) *Галіна* (15 носьбітаў), *Марыя* (11), *Ганна* (10), *Валянціна* (10), *Любоў* (9), *Тамара* (9), *Зінаіда* (8), *Ніна* (6), *Надзея* (6), *Антаніна* (5), *Алена* (5), *Вера* (5), *Фаіна* (5), *Аляксандра* (5), *Ангеліна* (5), *Ірына* (4), *Людміла* (4), *Настасся* (4), *Аліна* (4), *Таццяна* (4), *Яўгенія* (3), *Юлія* (3), *Вольга* (3), *Ядвіга* (3), *Лідзія* (3), нячастымі – імёны *Ала, Анфіса, Афанасія, Еўдакія, Зоя, Рамуальда, Феафанія*, *Франя* – па 2 носьбіты кожнае, рэдкімі – *Адэля, Аляўціна, Альбіна, Анэлія, Апаленія, Арыядна, Гелена, Генавефа, Глафіра, Дзіна, Домна, Елізавета, Ефрасіння, Кацярына, Крысціна, Ксенія, Леакадзія, Леаніда, Ліда, Лілія, Містрыдэя, Наталля, Раіса, Самонія, Сцепаніда, Тарэза, Тарэса-Сьекетуса, Феадосія, Феліцыя*, *Юня, Яніна* – па 1 носьбіце кожнае.

Сярэдні каэфіцыент аднайменнасці сярод мужчынскіх імён у гэты перыяд роўны 2: агульная колькасць нованароджаных хлопчыкаў складае 95, розных імён выкарыстана 43. Найбольш папулярнымі былі імёны *Іван* (11), *Генадзь* (4), *Аляксандр* (4), *Іосіф* (3), *Анатоль* (3), *Аркадзь* (2), *Часлаў* (2), *Віктар* (2), *Алег* (2), *Леанід* (2), *Панцялей* (2), *Ян* (2), *Вадзім* (2), *Рыгор* (2). Надзвычай рэдка пры называнні дзіцяці выкарыстоўвалі імёны *Адам*, *Ананій*, *Андрэй*, *Арцём*, *Браніслаў*, *Васіль*, *Вацлаў*, *Веньямін*, *Вікенцій*, *Віктар*, *Віталь*, *Дзмітрый*, *Іаан*, *Ілья*, *Казімір*, *Канстанцін*, *Міфодзій*, *Платон. Рыгор*, *Станіслаў*, *Сяргей*, *Эдмунд*, *Фелікс*, *Эдэсей*, *Юзэф*, *Сазонт, Яўген* – па 1 носьбіце кожнае.

У перыяд 1950-1979 гг. сярэдні каэфіцыент аднайменнасці сярод дзяўчынак роўны 3: агульная колькасць нованароджаных – 100, розных імён выкарыстана 39. Частымі былі імёны *Ірына* (9), *Таццяна* (9), *Зоя* (8), *Алена* (7), *Ала* (6), *Ганна* (5), *Валянціна* (5), *Галіна* (4), *Лілія* (4), *Наталля* (4), *Людміла* (3), *Тамара* (3), *Жанна* (3). Радзей пры называнні дзяўчынак выкарыстоўваліся імёны *Аксана, Антаніна*, *Марыя*, *Надзея* – па 2 носьбіты кожнае. Зусім рэдка ўжываліся імёны *Аліна, Ізольда, Лія, Настасся*, *Ніна, Нэля*, *Рэгіна, Яўгенія* – па 1 носьбіце кожнае.

Сярэдні каэфіцыент аднайменнасці сярод хлопчыкаў таксама складае 3: 156 чалавек, розных імён – 46. Частымі былі імёны *Уладзімір* (17), *Аляксандр* (17), *Мікалай* (10), *Сяргей* (10), *Анатоль* (10), *Іван* (8), *Міхаіл* (7), *Васіль* (6), *Юрый* (6), *Віктар* (5), *Генадзь* (5), *Пётр* (4), *Вячаслаў* (3), *Дзмітрый* (3), *Алег* (3), *Віталь* (3). Меншай папулярнасцю карысталіся імёны *Аляксей*, *Андрэй*, *Аркадзь*, *Валерый, Ілья*, *Леанід*, *Раман* – па 2 носьбіты кожнае. Рэдкімі былі найменні *Агшын*,

Репозиторий ВГУ

Альфрэд, *Антон*, *Ахмед*, *Валянцін*, *Вікенцій*, *Генрык*, *Георгій*, *Ігар*, *Ігнат*, *Іосіф*, *Казімір*, *Леанард*, *Міледзій*, *Мірон*, *Міфодзій*, *Рамуальд*, *Рышард*, *Станіслаў*, *Сцяпан*, *Сямён*, *Эдмунд*, *Ягор*, *Якаў* – па 1 носьбіце кожнае.

У перыяд 1980-2009 гг. сярэдні каэфіцыент аднайменнасці сярод дзяўчынак складае 2: агульная колькасць нованароджаных – 68, розных імён – 40. Найбольш частымі былі імёны *Алена* (5), *Вольга* (5), *Аксана* (4), *Вікторыя* (4), *Наталля* (3), *Марына* (3), *Надзея* (2), *Алеся* (2), *Зоя* (2), *Анжэліна* (2), *Ларыса* (2), *Крысціна* (2), *Кацярына* (2), *Святлана* (2), *Алёна* (2), *Таццяна* (2). Рэдка пры называнні дзяўчынак выкарыстоўваліся імёны *Ада*, *Аляксандра*, *Аляўціна*, *Васіліна*, *Вікторыя*, *Ганна*, *Дар'я*, *Еўдакія*, *Жанна*, *Іна*, *Ірына*, *Лізавета*, *Ліліта*, *Лэйла*, *Людміла*, *Маргарыта*, *Марыя*, *Настасся*, *Рзабала*, *Сняжана*, *Фарыда*, *Эліна*, *Юлія*, *Яўгенія* – па 1 носьбіце кожнае.

Мужчынскі імяннік у гэты перыяд істотна адрозніваецца ад жаночага па колькасці нованароджаных. Хлопчыкаў у гэтыя гады нарадзілася амаль у два разы больш (110), чым дзяўчынак (68), аднак розных імён сярод мужчынскіх усяго 32, таму сярэдні каэфіцыент аднайменнасці роўны 3. Частымі з'яўляюцца імёны *Аляксандр* (14), *Дзмітрый* (8), *Сяргей* (7), *Юрый* (7), *Уладзімір* (6), *Андрэй* (6), *Яўген* (6), *Мікалай* (5), *Дзяніс* (5), *Ілья* (4), *Антон* (4), *Ігар* (4), *Павел* (4), *Віктар* (3), *Уладзіслаў* (3). Радзей пры называнні хлопчыкаў выкарыстоўваліся імёны *Аляксей*, *Арцём*, *Вячаслаў*, *Іван*, *Кірыл* – па 2 носьбіты кожнае. Вельмі рэдка даваліся імёны *Алег*, *Анатоль*, *Вадзім*, *Валерый*, *Віктар*, *Іван*, *Леанід*, *Міхаіл*, *Станіслаў*, *Часлаў*, *Ягор*, *Максім* – па 1 носьбіце кожнае.

Заключэнне. У XX–XXI стст. мужчынскія і жаночыя імёны выкарыстоўваліся нераўнамерна. Адны з іх сустракаліся адзін раз ў стагоддзе (жаночыя *Ада*, *Арыядна*, *Ванда*, *Гелена*, *Генавефа*, *Леаніла*, *Лідзія*, *Ліліта*, *Рыма*, *Самонія*, *Сняжана*, *Сцепаніда*, *Тарэса-Сьекетуса*, *Феадосія*; мужчынскія *Агшын*, *Адам*, *Браніслаў*, *Веньямін*, *Генрык*, *Іаан*, *Канстанцін*, *Міледзій*, *Мірон*, *Платон*, *Рышард*, *Сазонт*, *Сямён*, *Фелікс*, *Юзеф* і інш.), другія – раўнамерна на працягу ўсяго стагоддзя (жаночыя *Аксана*, *Алена*, *Валянціна*, *Ганна*, *Зоя*, *Ірына*, *Людміла*, *Надзея*, *Таццяна;* мужчынскія *Аляксандр*, *Віктар*, *Віталь*, *Іван*, *Мікалай*, *Пётр*, *Сяргей*, *Уладзімір*, *Юрый* і інш.).

Канец XX стагоддзя характарызуецца ўжываннем грузінскіх, казахскіх імён *(Агшын, Ахмед, Лэйла, Рзабала, Фарыда)*, што звязана, відаць, з пражываннем на тэрыторыі даследаваных вёсак грузінаў і казахаў.

Навукоўцы сцвярджаюць, што жаночыя імёны, утвораныя ад мужчынскіх, сталі з'яўляцца з другой паловы XX стагоддзя. Наш матэрыял паказвае, што такія найменні існавалі і ў першай палове XX стагоддзя: зрэз 1920-1949 гг. выявіў імёны *Сцепаніда* (ад Сцяпан), *Леаніда* (Леанід), а таксама *Аляксандра* (Аляксандр) – у 1920-1949 гг. і 1980-2009 гг., *Яўгенія* (Яўген) – на ўсіх зрэзах.

Жаночы імяннік Мёрскага раёна ў 1920–2009 гг. значна пераважае мужчынскі па колькасці найменняў: усяго пры называнні было выкарыстана 98 жаночых і 71 мужчынскае імя. Гэта важна адзначыць, таму што на працягу XVIII–XIX стст. (аж да 1917 г.) жаночы імяннік пастаянна ўступаў мужчынскаму па колькасці антрапанімных адзінак. Паскарэнне антрапанімных працэсаў у жаночай падсістэме іменніка пачалося менавіта пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі [1, 40].

Пяцёрка самых модных мужчынскіх і жаночых імён, як правіла, адрозніваецца сваім зместавым напаўненнем у розных храналагічных зрэзах. Аднак імёны *Але(ё)на, Аляксандр, Віктар, Таццяна* належаць да частых на працягу ўсяго даследаванага перыяду, імёны *Алег, Анатоль, Віктар, Галіна, Ганна, Генадзь, Іван, Тамара* – у 1920–1949 гг. і 1950–1979 гг., імёны *Уладзімір,*

Репозиторий ВГУ

Юрый – у 1950–1979 гг. і 1980–2009 гг., імя *Надзея* – у у 1920–1949 гг. і 1980–2009 гг.

Спіс літаратуры

1. Мезенка, Г.М. Беларуская антрапанімія: вучэбны дапаможнік / Г.М. Мезенка, Г.М. Дзеравяга, В.М. Ляшкевіч, Г.К. Семянькова. – Віцебск: УА "ВДУ імя П.М. Машэрава", 2009. – 254 с.

ОЗЕРО ОКОНО И ИСТОРИЯ ЕГО НАЗВАНИЯ

Т.И. Синкевич
Витебск, ВГУ имени П.М. Машерова

Традиционный взгляд, опирающийся на данные археологии и сведения лингвистики, говорит о том, что на Витебщине последовательно сменились финно-угорские, балтские и славянские племена. Процесс взаимовлияния языков, культур берет начало с дохристианских времен, когда предки белорусов, литовцев и др. жили еще племенами, а потому при топонимических исследованиях возникают сегодня значительные трудности, ибо многие названия происходят не от славянских корней, а от балтских, финно-угорских корней. Есть и названия, которые возможно отнести к славянским, но они содержат в своей основе такие древнеславянские корни, смысл которых уже потерян или затемнен до неузнаваемости последующими наслоениями.

Цель настоящего исследования – интерпретировать название озера *Оконо*, учитывая возможности происхождения названия как от славянских корней, так и от субстратных.

Материал и методы. Материалом исследования послужили названия водных объектов с основой *окон-*. Нами был применен метод сопоставительного анализа, метод реконструкции названия и метод лингвистического описания.

Результаты и их обсуждение. Возможность сопоставления основной части лимнонима и его форманта с теми или иными апеллятивами и формантами в разных языках позволит рассмотреть отдельное название как элемент системы названий исследованной нами территории. При интерпретации названия нами учитывалась общность географической среды, в которой сосуществуют предположительно родственные формы, кроме того мы принимали во внимание и признаки самого объекта, что, на наш взгляд, позволило реконструировать в географическом названии его семантику более обоснованно. Лимноним может быть идентичен апеллятиву, может иметь ряд формальных отличий от апеллятива, но далеко не всегда может быть возведен к «своему» апеллятиву и сопоставлен с его единственным значением, имеющим историко-культурное или географическое соответствие в условиях данной местности. Одним из условий доказательства принадлежности гидронима к тому или иному типу, может быть свидетельство исторических документов, в которых мы находим подтверждение интерпретации наименования озера, но чаще всего такие документs не сохранились или их вовсе не было, и названия не этимологизируются. Это нормальное явление, ибо во все времена были имена семантически прозрачные и имена с затемненной, неясной семантикой (как правило, они являются наследием более древних эпох; их включение в классификацию является затруднительным). Но ни одно имя не бывает случайным, оно обусловлено исторически, продиктовано уровнем социально-экономического развития своих создателей.

Репозиторий ВГУ